## Ад укладальніка

У зборніку змешчаны творы кампазітараў, што жылі на Беларусі ў XVI–XVII стст., у супярэчлівы гістарычны перыяд, адзначаны на сваім працягу рознымі па сутнасці і выніках падзеямі. Росквіт Беларуска-Літоўскага гаспадарства (Вялікага княства Літоўскага) і аб'яднанне яго з Каралеўствам Польскім; дзяржаўна-палітычны, культурны ўздым і шматлікія разбуральныя войны; пашырэнне гуманістычных ідэй, рэфармацыйная хваля і наступленне контррэфармацыі; развіццё рэнесанснага мастацтва, літаратуры, беларускага кнігадрукавання і паступовае выцясненне з афіцыйнага ўжытку беларускай мовы мовамі польскай і лацінскай — гэтыя і іншыя з'явы характарызавалі сацыяльна-палітычнае і культурна-мастацкае аблічча эпохі. Яе сімваламі і гордасцю сталі Францішак Скарына і Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і Мікола Гусоўскі, Мялецій Смятрыцкі і браты Зізаніі, Афанасій Філіповіч і Сімяон Полацкі — сусветна вядомыя беларускія асветнікі, філосафы, літаратары.

Паміж тым, мала каму сёння ў нас вядомы імёны музыкантаў, што працавалі на Беларусі ў адзін з імі час. І ўвогуле музычны "модуль" той эпохі пакуль яшчэ не вызначаны айчыннай музычна-гістарычнай навукай. Прычына — адсутнасць большасці і цяжкадаступнасць цудам захаваных крыніц, якія б дазволілі больш-менш поўна і адэкватна рэканструяваць карціну тагачаснай музычнай культуры Беларусі. Крыху дапамагчы ў гэтай справе заклікана дадзенае выданне, якое ўвядзе ў навуковую і канцэртна-выканальніцкую практыку Беларусі музычныя помнікі, што захаваліся ў замежных сховішчах і маюць непасрэднае дачыненне да гісторыі айчыннай культуры.

## Кароткія біяграфічныя звесткі

*Цыпрыян Базылік* — славуты пісьменнік, перакладчык, выдавец і кампазітар, які жыў і працаваў у Кракаве, Вільні і Бярэсці. Нарадзіўся ён прыблізна ў 1535 г. у Серадзі (Польшча), адукацыю набыў у Ягелонскім універсітэце. Ужо ў юнацкія гады Цыпрыян праславіўся сваім талентам і шырокімі ведамі ў галіне паэзіі і музыкі, што дазволіла яму ўвайсці ў прыдворныя колы караля Жыгімонта Аўгуста, атрымаць герб (у 1557 г.) і прозвішча вядомага тагачаснага палітыка, прыхільніка рэформаў Геракліта Базыліка.

У 1558 г. малады шляхціц становіцца прыдворным музыкантам віленскага ваяводы князя Мікалая Радзівіла Чорнага — аднаго з галоўных прадстаўнікоў рэфарматарскага руху ў Беларуска-Літоўскай дзяржаве. Далучаецца да кальвіністаў і Базылік. Ён прымае актыўны ўдзел у наладжванні выдавецкай справы ў Вільні і Бярэсці, дзе стварае і перакладае тэксты рэлігійнага і свецкага зместу.

У 1569 г. пасля смерці свайго патрона Базылік становіцца ўладаром берасцейскай друкарні. Тут ён выдае творы сацыяльна-палітычнага накірунку, непасрэдна не звязаныя з рэлігійнай тэматыкай, а з 1574 г. публікуе аналагічную літаратуру і ў іншых друкарнях. Звесткі пра Базыліка абрываюцца ў 1600 г., калі выходзяць у свет ягоныя вершы "Аб вартасці герба Варнія" у лацінскім перакладзе.

Цыпрыян Базылік увайшоў у гісторыю ўсходнееўрапейскай культуры перш за ўсё як пісьменнік і перакладчык – аўтар вершаванага апісання "падзей, звязаных са смерцю Хальжбеты з Шыдлаўца Радзівіл" (1562 г.), паэмы пра гібель воіна Сецыгнеўскага ў бітве з туркамі (1570 г.), алегарычнай сатыры "Судовы разбор чарцей", мноства перакладаў з лацінскай мовы твораў М. Барлетыуса (1569 г.), М. Олаха (1574 г.), А. Маджэўскага і інш. З музычных опусаў Базыліка ў гістарычных крыніцах нагадваюцца песні і псалмы, надрукаваныя ў Бярэсці ў 1558–1569 гг., а таксама 11 чатырохгалосых песень, выдадзеных у 1556–1559 гг. у кракаўскіх друкарнях Лазара Андрысовіча і Мацеуша Зыбенайхера. Вядома таксама, што кампазітар удзельнічаў у падрыхтоўцы да выканання Берасцейскага канцыянала Яна Зарэмбы (1558 г.).

Для музычных твораў Цыпрыяна Базыліка, якія дайшлі да нашага часу, характэрна сувязь з пратэстанцкай музычнай традыцыяй, адзначанай высокім развіццём харала з уласцівай для яго ўзвышанасцю пачуццяў, прастатой выразных сродкаў і строгасцю формы.

Адносна мала вядома ў гісторыі культуры Беларусі і імя ***Вацлава з Шамотул*** – аднаго з буйных прадстаўнікоў усходнееўрапейскага Адраджэння. Нарадзіўся ён каля 1526 г. (па некаторых крыніцах – у 1533–1537 /?/ г.) у горадзе Шамотулы, што недалёка ад Познані, у мяшчанскай сям'і. Вучыўся ў Кракаўскай акадэміі, у маладыя гады служыў сакратаром у трокскага кашталяна Гераніма Хадкевіча ў Вільні. У 1547 г. Вацлаў атрымлівае пачэсную пасаду спевака і кампазітара ў прыдворнай капэле Жыгімонта Аўгуста ў Кракаве. Тут ён сустракаецца з вядомым у свой час лютністам, арфістам і спеваком, рэгентам ксяндзом Янам Вяжбоўскім, які аказаў значны ўплыў на маладога музыканта.

Паступова Вацлаў набывае рознабаковы мастацкі вопыт, ён удзельнічае ў касцёльных службах і прыдворных канцэртах, вывучае творы славутых поліфаністаў – прадстаўнікоў франка-фламандскай, італьянскай і польскай школ, а таксама бытавую (галоўным чынам лютневую) музыку свайго часу.

У 1551 г. Вацлаў разам з іншымі прыдворнымі капэлістамі, што суправаджалі караля, пабываў у Вялікім княстве Літоўскім, а ў 1555 г. паступіў на службу да князя Мікалая Радзівіла Чорнага. Пры княскім двары ён зближаецца з прадстаўнікамі кальвініцкага руху, разам з Цыпрыянам Базылікам займаецца друкарскай справай, прымае ўдзел у стварэнні ўжо нагаданага Берасцейскага канцыянала ("Песні хвал боскіх", 1558 г.). Гэтым і абмяжоўваюцца біяграфічныя звесткі пра кампазітара. Вядома яшчэ толькі, што памёр ён у 1567 ці 1568 г.

Вацлаў з Шамотул лічыўся ў свой час адным з самых аўтарытэтных кампазітараў. Ягоным мастацтвам захапляўся вядомы дзеяч Рэфармацыі і Адраджэння паэт Анджэй Тшэцэскі, а таксама літаратар-публіцыст Станіслаў Ажэхоўскі, які назваў Вацлава "лепшым, натхнёным спеваком".

Кампазітара высока цанілі і пры двары: менавіта яму даручалася стварэнне музыкі да самых адказных прыдворных урачыстасцяў, напрыклад, цырымоніі шлюбу Жыгімонта Аўгуста з Кацярынай Аўстрыйскай (1553 г.). Музыку Вацлава з Шамотул ведалі не толькі ў Каралеўстве Польскім і Вялікім княстве Літоўскім, але і ў іншых краінах Еўропы. Так, у 1554 г. у Нюрнбергу ягоны матэт быў выдадзены ў зборніку разам з творамі выдатных майстроў тагачаснага музычнага мастацтва – А. Віларта, М. Гомберта, Ф. Вердэлы і інш. Музычная спадчына кампазітара ахоплівае творы розных жанраў – месы, матэты, псалмы і інш. Да нашага часу дайшло, аднак, няшмат: некалькі песень, 4-х галосых матэтаў, іншых 4-х і 6-ці галосых літургічных твораў, выдадзеных у Кракаве ў розныя гады.

Мяркуючы па гэтых опусах, напісаных як на лацінскія, так і на польскія тэксты (Міхаіла Рэя і Анджэя Тшэцэскага), кампазітар, дасканала валодаючы тэхнікай шматгалосага пісьма, не толькі працягваў нідэрландскую поліфанічную традыцыю, але і ўвасабляў некаторыя істотныя рысы свецкай гуманістычнай лірыкі з яе прасветленасцю эмацыянальна-вобразнага зместу, рэльефнай акрэсленасцю мелодый, чысцінёй гарманічных "вертыкаляў" і дакладнасцю формы.

Сярод прадстаўнікоў усходнееўрапейскага мастацтва позняга Адраджэння прыцягвае ўвагу вядомы лютніст і кампазітар ***Войцах Длуграй***, жыццё якога таксама было ў пэўны перыяд звязана з Беларуссю. Біяграфічных звестак пра музыканта захавалася няшмат.

Нарадзіўся ён у 1550 ці 1557–1558 г. (месца нараджэння невядома). Музыкай захапляўся, відаць, з малых гадоў, бо ўжо тады яго называлі "бандурыст Войташэк". Музычную адукацыю атрымаў дзякуючы мецэнату Самуэлю Збароўскаму, пры двары якога і застаўся працаваць малады музыкант. Але не назаўсёды. Каля 1579 г. ён уцякае ад свайго жорсткага апекуна і трапляе ў адзін з кракаўскіх кляштараў, адкуль яго хутка выганяюць. Тады Войцах вяртаецца да Збароўскага, жыве ў яго некаторы час, а потым зноў уцякае, "прыхапіўшы" лісты, якія кампраметавалі гаспадара і ягонага брата.

У хуткім часе Длуграй уваходзіць у давер да караля Стэфана Баторыя і, дзякуючы сваёй музычнай адоранасці, атрымлівае пасаду прыдворнага лютніста. У гады службы (1583–1586 гг.) ён трапляе ў Гародню, дзе, як вядома, знаходзіўся каралеўскі двор. Пасля смерці Баторыя Длуграй, баючыся палітычных ганенняў, пакінуў Рэч Паспалітую. Памёр ён пасля 1619 г.

З твораў кампазітара да нашага часу дайшлі танцавальныя п'есы для лютні: фантазіі, транскрыпцыі італьянскіх віланэл, змешчаныя ў зборніку Ж. Б. Безара (Кёльн, 1603 г.), Табулатуры Хайнхофера (1603–1604 гг.) і Длугарая (1619 г.) (за-

хоўваюцца ў Германіі). Усе яны напісаны ў познерэнесансным гамафонна-гарманічным стылі і з'яўляюцца тыповымі ўзорамі танцавальнай музыкі свайго часу.

Сярод музыкантаў, што працавалі на Беларусі ў XVI ст., вядома і імя *Крыштафа Клябана* – высокапрафесійнага музыканта-інструменталіста, спевака, капельмайстра і кампазітара. З нешматлікіх біяграфічных крыніц вядома, што нарадзіўся ён у 1550 г. у Круляўцы, а памёр пасля 1616 г. Да 1565 г. працаваў флейтыстам у Петрокаве, а потым паступіў на службу ў каралеўскую капэлу Жыгімонта Аўгуста. На пасадзе прыдворнага музыканта, інструменталіста, спевака, кампазітара, капельмайстра Клябан заставаўся і ў гады праўлення Стэфана Баторыя і Жыгімонта IV.

У перыяд працы пры двары Баторыя Клябан некаторы час жыў у Гародні, кіраваў там інструментальнай капэлай і, згодна з тагачаснай традыцыяй, пісаў для яе шмат твораў. Але да нас дайшлі звесткі толькі пра ягоныя "спевы пры лютні", якія аздаблялі ўрачыстасці пры каралеўскім двары (на словы Яна Каханоўскага, выдадзены ў Кракаве ў 1588 г.), а таксама "Песні Славянскай Каліопы" (Каліопа – муза спеваў, багіня эпічнай паэзіі), напісаныя з нагоды ўступлення на трон Жыгімонта (на тэксты С. Грахоўскага, выдадзены ў Кракаве ў 1588 г.). Апошні з нагаданых твораў аб'ядноўвае шэсць невялікіх (ад 4 да 16 тактаў) песень панегірычнага зместу, прызначаных хутчэй за ўсё для голасу ў суправаджэнні лютні.

Акрамя названых кампазітараў у першай палове XVII ст. на Беларусі пры двары канцлера Альбрэхта Радзівіла ў Нясвіжы працаваў арганіст і кампазітар *Андрэй Рагачэўскі.* Нарадзіўся ён у канцы XVI ст., дата смерці невядомая. У 1630-я гады ім былі напісаны дзевяціґалосы матэт для двух хораў і чатырохгалосая канцона. Па сваёй стылістыцы харавыя творы Рагачэўскага блізкія да паліфанічных твораў заходнееўрапейскіх кампазітараў эпохі Адраджэння і ранняга барока.

Музычная спадчына ўсіх названых вышэй кампазітараў належыць некалькім народам і з'яўляецца іх агульным здабыткам. Яе вяртанне ў кантэкст культуры Беларусі – працэс неабходны для айчыннага мастацкага жыцця.

## Некаторыя метадычныя заўвагі

Змешчаныя ў зборніку творы можна выконваць як у арыгінальным варыянце (інструментальныя – на лютне), так і ў пералажэнні для розных саставаў. Гэта не супярэчыць мастацкай практыцы Рэнесанса і ранняга барока, для якой была характэрна рухомасць выканальніцкага складу.

Пры інтэрпрэтацыі твораў неабходна ўлічваць іх вобразна-стылёвыя асаблівасці, якія патрабуюць выкарыстання адпаведных сродкаў выканальніцкага ўвасаблення: эмацыянальнай стрыманасці, вывер анасці агогікі, дакладнасці фразіроўкі. У хара-

вых творах трэба захоўваць тэмбравае адзінства галасоў і іх збалансаванасць. У інструментальных – добрае адчуванне гарманічных вертыкаляў і паслядоўнасцяў пры рэльефнай акрэсленасці гарызантальных ліній.

## Бібліяграфічная даведка*

Усе творы, змешчаныя ў зборніку, друкуюцца паводле выданняў XVI–XVII стст., адрэдагаваных у нашыя дні ў адпаведнасці з існуючай сістэмай нотнага запісу польскімі даследчыкамі.

Песні і псалмы Цыпрыяна Базыліка ўпершыню былі выдадзены ў Кракаве ў 1556–1559 гг. У XX ст. выйшлі пад рэдакцыяй З. Швейкоўскага (**Bazylik C. Pieśni na 4-głosowy chór a cappella. Kraków, 1958**).

Песні Вацлава з Шамотул на тэксты А. Тшэцэскага і М. Рэя ўбачылі свет у Кракаве ў 1549–1558 гг. У нашыя дні адрэдагаваны З. Швейкоўскім (**Wacław z Szamotuł. Pieśni na 4-głosowy chór mieszany a cappella. Kraków, 1964**).

Песні Кшыштофа Клябана на словы С. Грахоўскага друкаваліся ў Кракаве ў 1588 г. Сучасная рэдакцыя З. Швейкоўскага (**Muzyka w dawnym Krakowie. Kraków, 1964**).

Лютневая табулатура Войцэха Длугарая друкуецца паводле рукапісу 1619 г. у рэдакцыі З. Швейкоўскага (**Muzyka w dawnym Krakowie. Kraków, 1964**).

Фантазія і віланелы В. Длугарая ўпершыню былі надрукаваны ў Кёльне ў 1603 г. У XX ст. адрэдагаваны П. Пазнякам (**Długoraj Wojciech. Fantazje i Wilanele. Na lutnię (Gitarą). Kraków, 1964**).

Матэты А. Рагачэўскага друкуюцца паводле так званай Пельплінскай табулатуры з першай паловы XVII ст. у расшыфроўцы А. Суткоўскага (**Andrzej Rohaczewski. Crucifixus surrexit. Kraków, 1962**).

*Пераклад тэкстаў з польскай мовы на беларускую зрабіў* — *У. Мархель*

*Кантамінацыя* — *В. Дадзіёмавай*

*Графічныя праўкі ўнёс* — *У. Казлоў*

---

* Па тэхнічных прычынах у выданні тэксты вакальных твораў даюцца толькі на беларускай ці лацінскай мовах.